*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!*
*ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ*



# НАША СЛОВА

**Газета выходзіць з сакавіка 1990 года** **№ 49 (940) 9 СНЕЖНЯ 2009 г.**

## Наваградак у каралеўскай кароне

Сёлета Наваградак адзначыў 965-я ўгодкі з дня заснавання. Дата не надта круглая, і святкаванне было не надзвычай шумным, але падзея не засталася па-за ўвагай гарадскіх уладаў. Былі праведзены значныя работы па дабраўпарадкаванні горада. Прынамсі, адна з цэнтральных вуліцаў, якая выводзіць падарожнага ў бок Карэлічаў і Міра, была пашырана, займела новыя тратуары і новую разметку. А яшчэ на ўездзе ў горад з гэтага боку быў устаноўлены арыгінальны ўязны знак, у якім рэалізавана ідэя каралеўскага горада Наваградка. На знаку размешчана назва горада, год заснавання - 1044, герб горада, а над усім прымацавана каралеўская карона, як напамін усім: і сваім, і падарожным, што некалі Наваградак быў сталіцай не толькі Вялікага Княства Літоўскага, але і **Літоўскага каралеўства**, бо кароль Міндоўг не мог кіраваць княствам, а мусіў кіраваць каралеўствам. І хоць існавала тое каралеўства нядоўга, але яно ў нашай гісторыі было, і забываць пра гэта ніяк не выпадае.




## Каляндар “Родны край” - лепшы падарунак пад Новы год




Сёлета павялічаным накладам у 13000 асобнікаў быў выдадзены каляндар “Родны край”. Летась наклад складаў 7000 і быў цалкам раскуплены, а вось сёлета каляндар “Родны край” да гэтага часу ёсць у продажы ў многіх крамах, хаця паступіў яшчэ ў верасні.

Сакратарыят ТБМ звяртаецца да кіраўнікоў арганізацый і сяброў ТБМ з пажаданнем пасадзейнічаць поўнай рэалізацыі календара ў кожным горадзе, у кожнай краме. Шаноўныя беларусы! Падарыце беларускі каляндар “Родны край” сваім сваякам, сябрам, знаёмым. Добры і арыгінальны падарунак. Пры тым, што каляндар каштуе нядорага, атрымаецца “танна і сярдзіта”.

Каляндар “Родны край” утрымоўвае шмат цікавага пра Беларусь, яе гісторыю, культуру, прыроду, карысныя парады па вядзенні хатняй гаспадаркі, выхаванні дзяцей, парады садаводу і агародніку, рэцэпты народнай медыцыны і шмат чаго іншага.

Беларус з беларускім клендаром - гэта норма.

Дарэчы, у Менску каляндар “Родны край” без праблемаў яшчэ можна набыць у кнігарні “Акадэмкніга”.

ISSN 2073-7033

**11 снежня**

ў Палацы культуры ветэранаў (вул. Я. Купалы, 21)
вядомы беларускі бард і актор
**ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ**
з праграмай “Лепшае і новае”.
Пачатак 19.00. Квіткі ад 15 000 да 20 000.
Даведкі: 6490888

## Калекцыянер. Навуковец. Стваральнік прыватнага музея

*(Да 70-годдзя з дня нараджэння Анатоля Белага)*



**БЕЛЫ Анатоль Яўхімавіч** нарадзіўся 10 снежня 1939 года ў горадзе Старыя Дарогі Менскай вобласці. Беларускі грамадска-культурны дзеяч, навуковец, калекцыянер, стваральнік прыватнага мастацкага музея ў горадзе Старыя Дарогі. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1967). З 1995 года выкладаў у БДУ. Старшыня грамадска-асветніцкага клуба “Спадчына” (1984). Сябар Саюза мастакоў Беларусі (1995**)**. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў (1999). Прафесар, дыпламант Міжнароднага Кембрыджскага цэнтра (Англія, 1999). Сябар Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі (Менск, 2005).

Сабраў вялікую калекцыю твораў жывапісу, графікі, медальернага і дэкаратыўнага мастацтва (каля 3000 адзінак). Арганізатар тэматычных выставаў: “Кастусь Каліноўскі і студзеньскае паўстанне 1863 года ў Беларусі” (Менск, 1986, 1990, 1991; Магілёў, 1988, 1991), “Францішак Скарына” (Менск, Яраслаўль, ЗША, 1985, 1986, 1990, 1991), “Максім Багдановіч” (Менск, 1996), “Дзеячы беларускага замежжа” (Менск, 1994, 1996), “Уладары старажытнай Беларусі” (Менск, 1996), “Любіць Радзіму – шанаваць родную мову” (Менск, 1990, 1991, 1994, 1996), “Гісторыя Беларусі ў мастацкіх вобразах і партрэтах” (Менск, ЗША, 1990, 1991, 1996), “Медальернае мастацтва Беларусі” (Менск, 1984).

Выдаў альманахі: “Спадчына “Спадчыны” (1994), “Скрыжалі “Спадчыны” (1996, 1998, 2006, 2007), “Прымалі закон аб мовах” (1995, сумесна з Л. Лычом), плакаты- календары “Радавод полацкіх і вялікіх беларускіх (літоўскіх) князёў” (1995), “Старажытная Беларусь часоў Вітаўта Вялікага” (1996), “Яго чакала Беларусь чатыры стагоддзі” – зборнік дакументаў і матэрыялаў да 85-годдзя з дня нараджэння М.І.Ермаловіча (2007), 5 каталогаў, даведачную літаратуру, звыш 150 артыкулаў пра беларускае мастацтва і яго гісторыю. Тэмы навуковай дзейнасці: “Францішак Скарына – мастак эпохі Адраджэння” і “Вобраз Кастуся Каліноўскага ў выяўленчым мастацтве”.

На аснове сваёй калекцыі ў 1990 годзе заснаваў, а 11 снежня 1999 года адкрыў на сваёй сядзібе ў горадзе Старыя Дарогі прыватны музей выяўленчага мастацтва. Музей мае 4 будынкі, 8 залаў, плошча экспазіцыі каля 500 кв. м., на якой экспануецца каля 1700 твораў жывапісу, графікі, скульптуры, медальернага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі. У экспазіцыі прадстаўлены партрэты князёў, палкаводцаў, гетманаў, палітычных, дзяржаўных, рэлігійных, культурна-асветніцкіх дзеячоў Беларусі і яе дыяспары, батальныя карціны, краявіды, помнікі дойлідства, гарады і замкі Беларусі, бюсты і медалі, зробленыя ў гонар выбітных дзеячоў Бацькаўшчыны.

А.Я. Белы – ініцыятар і арганізатар устаноўкі помнікаў: М.Багдановіча ў Яраслаўлі (1994, аўтар С. Вакар); А.Я. Багдановіча ў г.п. Халопенічы (1998, аўтар У. Лятун); у дворыку Беларускага дзяржаўнага універсітэта Францішка Скарыны (1988, аўтар С. Адашкевіч), М. Гусоўскага (1998, аўтар У. Панцялееў), К. Тураўскага (1996, аўтар А.Прохараў), Еўфрасінні Полацкай (1999, аўтар І. Голубеў), “Дыспут: В. Цяпінскі і С. Будны” (2000, аўтар І. Голубеў); у Менскай праваслаўнай епархіі К.Тураўскага (1995, аўтар Ю. Платонаў); у Полацку Еўфрасінні Полацкай (2000, аўтар І. Голубеў); у горадзе Зельва Гарадзенскай вобласці Л. Геніюш (2002, аўтар М. Іньkоў); на сядзібе музея ў Старых Дарогах Л. Геніюш (2001, аўтар М. Іньkоў), А. Бярозку (2001, аўтар У. Лятун), М. Багдановічу (2001, аўтар С. Вакар), А.Я. Багдановічу (2001, аўтар М. Несцярэўскі); М. Ермаловічу ў гарадах Старыя Дарогі і Маладзечна (2002, аўтар У. Мелехаў**)**.

¨н удзельнік Установчых з’ездаў Беларускага народнага фронту, Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Сумесна з сябрамі клуба “Спадчына” у 1985 годзе выступіў ініцыятарам звароту ў ЦК КПБ, Саўмін БССР і ВС БССР аб ушанаванні 125-х угодкаў студзеньскага паўстання 1863 года пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Адзін з прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, якія падпісалі ліст ў ЦК КПСС аб стане беларускай мовы і культуры ў Беларусі. Адзін з ініцыятараў пераносу магілы М. Багдановіча ў Менск. Адзін з актыўных заснавальнікаў таварыства “Бацькаўшчына”. Адзін з заснавальнікаў і Ганаровы сябар рэдкалегіі беларуска-амерыканскага часопіса “Полацак” (1991, Кліўленд, ЗША). Перадаў: Гомельскаму дзяржаўнаму універсітэту імя Францішка Скарыны для музея імя Францішка Скарыны 169 твораў мастацтва (1989); Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту – 103 творы графікі (1983); гораду Старыя Дарогі – 104 графічных творы, 17 медалёў, помнік Францішку Скарыну (аўтар С. Адашкевіч) – усе ў 1997 годзе.

Узначальвае Камітэт Ушанавання (заснаваны ў 1996), на рахунку якога ганаравана ордэнамі, Кубкамі “Спадчыны”, медалямі звыш 250 дзеячоў навукі і культуры Беларусі.

За сваю дзейнасць на ніве нацыянальнага Адраджэння і захавання нацыянальнай спадчыны Камітэтам ушанавання ганараваны ордэнам “Гонар Айчыны” (25.03.1997); ордэнам Кірылы Тураўскага, дзвюма граматамі Мітрапаліта Менскага і Слуцкага Філарэта; медалём імя Яна Масарыка Міністэрства замежных спраў Чэшскай Рэспублікі ў знак падзякі за карыснае супрацоўніцтва ў паглыбленні беларуска-чэшскіх стасункаў (14.11.2007). За ўдзел у мітынгах быў неаднаразова арыштаваны. За свае палітычныя перакананні і дзеянні тройчы быў звольнены з працы выкладчыка БДУ.